Паважаныя чытачы!

Фонд чытальнай залы цэнтральнай гарадской бібліятэкі папоўніўся ўнікальным выданнем у 20-ці тамах “Кніжная спадчына Францыска Скарыны”. У фармат выдання ўвайшло 20 асобных кніг: «Кніга Быцця», «Кніга Выхад», «Кніга Лявіт», «Кніга Лічбы», «Кніга Другі Закон» і г.д. Кнігі цудоўна, якасна афармлены, яны з максімальнай паўнатой узнаўляюць усе ўнікальныя асабістасці арыгіналаў**.** Матэрыялы прадстаўлены на беларускай, рускай, англійскай і ўсходнеславянскай мовах.

Выданне ўяўляе сабой поўнае факсімільнае ўзнаўленне кніжнай спадчыны Францыска Скарыны. Яно заклікана пазнаёміць шырокую грамадскасць з адным з найбольш каштоўных скарбаў айчыннай культуры – выданнямі беларускага і ўсходнеславянскага першадрукара, якія захоўваюцца ў розных краінах свету.

Шматтомнае факсімільнае выданне – першы поўны збор кніг, надрукаваных Скарынам у Празе і Вільні. У яго аснову пакладзены электронныя копіі кніг, што захаваліся ў бібліятэках і музеях Беларусі, Расіі, Украіны, Германіі і інш. краін. Для лепшага разумення сутнасці і значэння спадчыны беларусага першадрукара кожная з яго кніг выйшла ў суправаджэнні навуковых каментарыяў, а таксама з перакладамі яго прадмоў і пасляслоўяў на беларускую, рускую і англійскую мовы.

Выданні будуць карыснымі для даследчыкаў, выкладчыкаў, студэнтаў, навучэнцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй і культурай Беларусі.

Сардэчна запрашаем чытачоў у чытальную залу цэнтральнай гарадской бібліятэкі пазнаёміцца з унікальным выданнем спадчыны беларускага першадрукара.